■ Грошы

## ПЕНСІЮ ВЫПЛАЦЯЦЬ ДА КАЛЯД

**Пачалася датэрміновая выплата пенсій і дапамог за 7 студзеня.**

Датэрміновая выплата пенсій (дапамог) за 7 студзеня ажыццяўляецца наступным чынам: пачынаючы з 4 студзеня — у аддзяленнях паштовай сувязі Брэсцкай, Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей; пачынаючы з 5 студзеня — у аддзяленнях паштовай сувязі Гомельскай, Гродзенскай абласцей і Мінска. 7 студзеня будуць працаваць толькі дзяжурныя аддзяленні паштовай сувязі. Дадатковую інфармацыю аб рэжыме работы аддзяленняў паштовай сувязі ў краіне можна атрымаць па нумары 154.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

## ЗАРОБКІ БЮДЖЭТНІКАЎ КРЫХУ ПАДРАСТУЦЬ

### Павысілася тарыфная стаўка першага разраду

**З 1 студзеня гэтага года яе памер складае 31 рубель. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 30 снежня 2016 года №1115. Устанавілі таксама штомесячныя дыферэнцаваныя даплаты работнікам бюджэтных арганізацый, якія тарыфікуюцца 1—14 разрадамі, у памерах 8,6—5,7 рубля.**

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, кіраўнікам бюджэтных арганізацый неабходна будзе забяспечыць пераразлік заробку работнікаў у адпаведнасці з новымі памерамі тарыфнай стаўкі першага разраду і штомесячных дыферэнцыраваных даплат.

Мінулы раз тарыфная стаўка першага разраду, ад якой залежаць заработныя платы бюджэтнікаў, павышалася ў леташнім красавіку — да 29,8 рубля.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

■

## АРЫФМЕТЫКА АДУКАЦЫІ

### Усе школы Магілёўшчыны ўключаны ў фінансавы эксперымент

**Пілотны праект па апрабацыі нарматыўнага фінансавання ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе пашыраны. Адпаведнае рашэнне змяшчаецца ў пастанове Савета Міністраў ад 29 снежня 2016 года №1109.**

У рамках эксперымента аб'ёмы фінансавання, што накіроўваюцца на навучанне і выхаванне, «прывязваюцца» да колькасці навучэнцаў.

У 2017 годзе праект, па якім грошы «ідуць» за вучнем, будзе рэалізоўвацца ў Баранавічах, Брэсце, Віцебску, Жодзіне, Наваполацку, Скідалі і Фаніпалі, Бераставіцкім, Лідскім і Салігорскім раёнах, Савецкім і Цэнтральным раёнах Гомеля, Першамайскім раёне Мінска, а таксама на тэрыторыі ўсёй Магілёўскай вобласці.

У 2016 годзе ў ім прынялі ўдзел 186 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, якія ахопліваюць 127,3 тыс. школьнікаў. Плануецца, што сёлета ў яго будуць ўцягнуты 642 установы агульнай сярэдняй адукацыі і 292,1 тыс. школьнікаў.

Новы механізм прадугледжвае фарміраванне бюджэту ўстановы на падставе сярэднегадавых паказчыкаў колькасці навучэнцаў розных катэгорый (па ступенях навучання, колькасці дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця і колькасці вучняў, якія наведваюць групы падоўжанага дня), нарматыву бюджэтнай забяспечанасці выдаткаў і карэктуючых каэфіцыентаў.

У 2017 годзе базавы нарматыў на аднаго навучэнца складае 1284,66 рубля ў год для гарадскіх школ і 2862,16 рубля — для школ, размешчаных у сельскай мясцовасці. Мяркуецца, што новы механізм забяспечыць больш рацыянальнае выкарыстанне бюджэтных сродкаў, што ў выніку адаб'ецца і на заробках педагогаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Стыхія

# ЦЫКЛОН AXEL: СІТУАЦЫЯ ПАД КАНТРОЛЕМ

**У бліжэйшыя суткі снегавое покрыва ў краіне будзе павялічвацца, паведамляюць сіноптыкі.**



Фота БЕЛТА.

А пакуль у сувязі з паніжэннем тэмпературы паветра і выпадзеннем снегу работнікі МНС сумесна з прадстаўнікамі органаў улады і работнікамі суб'ектаў гаспадарання вядуць маніторынг сітуацыі, трымаюць руку «на пульсе» для аператыўнага рэагавання і аказання неадкладнай дапамогі ў выпадку якіх-небудзь здарэнняў.

Напрыклад, бліжэй да абеду ўчора ў прыбіранні снегу на дарогах Мінскай вобласці было задзейнічана 196 адзінак тэхнікі ЖКГ і 420 рабочых, 520 адзінак тэхнікі іншых міністэрстваў і ведамстваў і 556 рабочых. Да ўборкі снегу на вуліцах сталіцы было прыцягнута 417 адзінак тэхнікі. Дагэтуль, паводле інфармацыі «Гаррамаўтадара», каля 300 машын было выведзена на вуліцы Мінска ў начную змену. У выпадку неабходнасці ў любы момант можа быць задзейнічана дадатковая тэхніка. Пастаянна праводзілася апрацоўка дарожнага палатна процігалалёднымі сродкамі. Ачысткай пешаходных зон, прыпынкаў грамадскага транспарту, уваходаў у падземныя пешаходныя пераходы займаліся больш за 800 прыбіральшчыкаў тэрыторый.

У Віцебскай вобласці дапамогу ў ачыстцы прыдамавых тэрыторый ад снегу гатовыя аказаць валанцёры БРСМ «Добрае сэрца». Для прыёму заявак у абласным маладзёжным камітэце створана «гарачая лінія». Просьбы аб дапамозе перадаюцца тэрытарыяльным падраздзяленням, якія шукаюць бліжэйшую брыгаду валанцёраў і накіроўваюць па адрасе заяўніка. А ў цэлым сітуацыя па вобласці была адносна спакойнай.

Ратавальнікі нагадваюць аўтаўладальнікам, што на дарогах неабходна быць вельмі ўважлівымі, асабліва ва ўмовах дрэннай бачнасці. Выбірайце мінімальную хуткасць руху і захоўвайце дыстанцыю паміж транспартнымі сродкамі. У выпадку пагаршэння ўмоў надвор'я варта зусім адмовіцца ад паездак. Калі мяцеліца заспела вас у дарозе, то спыніцеся каля населеных пунктаў, запраўчных станцый або ў любым месцы, дзе паблізу ёсць людзі, і перачакайце непагадзь. Памятайце, што аўтамабілі неабходна паркаваць такім чынам, каб яны не перашкаджалі працы снегаўборачнай тэхнікі.

Знаходзячыся на вуліцы, пазбягайце дрэў, якія стаяць паблізу, сцеражыцеся частак канструкцый і прадметаў, навіслых над будынкамі, абарваных правадоў ліній электраперадачы і іншых крыніц небяспекі. З сённяшняга дня пачынаецца значнае пахаладанне, таму варта засцерагчыся і ад марозу.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■

# «Праваслаўны свет» — у падарунак

**Беларуска-сербскія адносіны маюць выразны сяброўскі характар. І беларусаў, і сербаў аднолькава цікавяць складнікі духоўнага выхавання грамадства, маральнай трываласці нашых народаў. Пра гэта ішла гаворка і на сустрэчы беларускага пасла ў Сербіі Уладзіміра ЧУШАВА з Патрыярхам сербскім ІРЫНЕЕМ.**

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Сербіі перадаў Патрыярху віншаванні нашага Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі з Новым годам і Раством. А таксама ўручыў кіраўніку праваслаўнай царквы ў Сербіі ўнікальны альбом Выдавецкага дома «Звязда» — «Праваслаўны свет», дзе прадстаўлены абразы, што знаходзяцца ў калекцыях музеяў Беларусі, Расіі, Украіны.

У час сустрэчы былі абмеркаваны стан і перспектывы развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў гуманітарнай і духоўнай сферах. Падкрэслівалася неабходнасць захавання і ўмацавання духоўна-маральнага грунту дружбы паміж Беларуссю і Сербіяй.

Патрыярх Сербскі падзякаваў за атрыманне Сербскай праваслаўнай царквой фінансавых сродкаў у памеры 39 150 долараў ЗША, якія сабраны Беларускай праваслаўнай царквой для завяршэння будаўнічых работ у храме Святога Савы ў Белградзе. Ішла размова і пра магчымыя варыянты ўдзелу беларускага боку ў афармленні храма. Выказвалася меркаванне, што беларускія майстры змаглі б удзельнічаць у мазаічным афармленні купала і алтара храма ў складзе расійскай групы пад кіраўніцтвам акадэміка Расійскай акадэміі мастацтваў М. Мухіна. А таксама — у напісанні абразоў для афармлення храма.

Згадвалася і пра станоўчы вопыт стасункаў беларускіх і сербскіх кніжнікаў. Было адзначана, што існуе пагадненне Міністэрства інфармацыі і пасольства Беларусі ў Сербіі адносна правядзення ў Белградзе ў 2017 годзе «круглага стала» ў знак 500-годдзя беларускага кнігадрукавання.

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Камунальныя стасункі

## ЁСЦЬ ЧАС ДА... СЁННЯ

**Хто летась не паспеў аплаціць свае жыроўкі за лістапад, яшчэ можа аплаціць жыллёва-камунальныя паслугі без пені да 5 студзеня.**

Аб гэтым гаворыцца ў пастанове ўрада №946, дзе прапісана, што да 5 студзеня вызначаны нулявы памер пені за нясвоечасова або не ў поўным аб'ёме аплачаныя жыллёва-камунальныя паслугі (ЖКП) за лістапад. Такая часовая палёгка спажыўцам ЖКП была звязана з пераходам на сістэму аплаты праз АІС «Разлік-ЖКП». А вось за наступныя дні неаплаты будзе налічвацца пеня ў памеры 0,3% ад сумы за кожны дзень. Традыцыйна аплачваць камунальныя паслугі неабходна да 25 числа месяца.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■

■ Класныя навіны

## МАЙСТЭРСТВА НАСТАЎНІКА — НЕ ВЫПАДКОВАЯ ЎДАЧА

**Больш як чатыры сотні педагогаў з усёй краіны сталі ўдзельнікамі VI Рэспубліканскага Каляднага фестывалю педагагічнага майстэрства, які адкрыўся ўчора ў Мінску. Ініцыятыва яго правядзення належыць Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і Беларускаму педагагічнаму таварыству.**

— На свеце няма больш маральна-арыентаванай, адказнай і шматграннай прафесіі, чым прафесія педагога. Сярод яе прадстаўнікоў, якіх называюць лепшымі з лепшых, ёсць традыцыя — вучыць не толькі сваіх вучняў, але і шчодра дзяліцца сваім досведам і сваімі ідэямі з калегамі,— падкрэсліве **рэктар акадэміі, кандыдат фізіка-матэматычных навук Андрэй МАНАСТЫРНЫ**. — Майстэрства настаўніка — не выпадковая ўдача і не шчаслівая знаходка, а сістэматычная карпатлівая праца, пастаянныя пошукі і спробы самаўдасканалення...

Сёння мы кажам пра тое, што кожны ўрок павінен праходзіць у атмасферы інтэлектуальных, маральных і эстэтычных хваляванняў, сутыкненняў розных пунктаў погляду і меркаванняў, пошуку праўды і магчымых шляхоў вырашэння праблемы. І няважна, які прадмет выкладае настаўнік: галоўнае — якія ўмовы ён стварае на сваіх уроках для гарманічнага выхавання асобы.

На думку Андрэя Манастырнага, выхаваўчы патэнцыял урока ў многім залежыць ад прафесіяналізму педагога: ці з'яўляецца той для дзіцяці аўтарытэтам, ці стварае на сваіх уроках умовы для развіцця і пакарэння новых вышынь?

Ён падкрэсліве, што сёння настаўнікам стала намнога складаней працаваць з бацькамі вучняў, і справа не толькі ў тым, што аўтарытэт педагога як самага кампетэнтнага чалавека, як адзінай крыніцы ведаў ужо не абсалютны. Важнай праблемай стала разыходжанне ідэалаў у сям'і і школы: для чаго трэба вучыцца, што дадуць тыя ці іншыя веды і навыкі, якія мэты трэба ставіць перад сабой? Сям'я нярэдка імкнецца прывіць дзіцяці вельмі вузкапрагматычныя, матэрыяльныя і кар'ерысцкія ўстаноўкі...

Усяго на фестывалі запланавана правядзенне 77 майстар-класаў, педагагічных студый, урокаў для дарослых, практыкумаў, інтэрактыўных перапынкаў і іншых мерапрыемстваў, якія праводзяць члены Асацыяцыі настаўнікаў-метадыстаў «Імкненне» і клуба «Крыштальны журавель».

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ На слыху

# Па факце нападу на міліцыянера заведзена крымінальная справа

### Пацярпелы супрацоўнік характарызуецца станоўча

**Пра гэта паведаміў афіцыйны прадстаўнік ГУУС Мінгарвыканкама Аляксандр ЛАСТОЎСКІ. Нагадаем, 1 студзеня ў 6.40 раніцы па спецлініі «102» патэлефанавалі і паведамілі пра тое, што ў адной з кватэр жылога дома на сталічным праспекце Любімава шумяць, перашкаджаюць адпачываць. Па адрасе быў накіраваны супрацоўнік гарадскога аддзела міліцыі №2. Справа скончылася стралянінай, а ў сеціве пачалося абмеркаванне таго, што здарылася...**

Прыбыўшы па адрасе, сяржант С. пачуў гучны шум. На званок дзверы адчыніў грамадзянін Г. Супрацоўнік міліцыі прадставіўся, растлумачыў прычыну візіту, папрасіў не перашкаджаць суседзям адпачываць. У адказ грамадзянін Г., які знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення, раптам нанёс удар супрацоўніку міліцыі ў вобласць грудзей, пасля чаго яшчэ серыю ўдараў у галаву, а затым паспрабаваў адабраць табельную зброю міліцыянера, прыводзіць словы Аляксандра Ластоўскага сайт ГУУС Мінгарвыканкама.

Аднак супрацоўнік міліцыі папярэдзіў грамадзяніна аб прымяненні табельнай зброі, калі той не спыніць сваё супрацьпраўныя дзеянні. Але дарэмна: правапарушальнік схапіўся за запясце міліцыянера і спрабаваў вырваць пісталет. У выніку сяржант міліцыі ў час барацьбы зрабіў папераджальны стрэл убок, а потым яшчэ два стрэлы, імкнучыся прычыніць нападніку найменшую шкоду. Пасля гэтага правапарушальнік быў затрыманы і дастаўлены ва ўстанову аховы здароўя на лячэнне: у яго два скразныя раненні ў вобласці грудзей і левай ступні. Супрацоўнік міліцыі быў шпіталізаваны з чэрапна-мазгавой траўмай і іншымі пашкоджаннямі.

Па гэтым факце заведзена крымінальная справа па артыкуле 363 Крымінальнага кодэкса за супраціўленне супрацоўніку органаў унутраных спраў або іншай асобе, якія ахоўваюць правапарадак.

Пасля здарэння з'явілася інфармацыя, што быццам бы супрацоўнік міліцыі адразу пасля інцыдэнту з выкарыстаннем табельнай зброі пакінуў месца здарэння. Міліцыя абвергла чутку, заявіўшы, што сяржант, знаходзячыся ў пад'ездзе дома, тут жа паведаміў пра тое, што адбылося, сказаў пра неабходнасць шпіталізацыі пацярпелага і папрасіў дапамогу. Апошняя была па названым адрасе праз некалькі хвілін. Супрацоўнік міліцыі характарызуецца станоўча, ён вытрыманы, спакойны, ураўнаважаны, канфліктных сітуацый імкнецца пазбягаць.

Па факце здарэння праводзяцца следчыя дзеянні.

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

■